**Н. М. Борсук**
Брэст, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт

# СПАСЦІЖЭННЕ ДУХОЎНА-ГУМАНІСТЫЧНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ГЕРОЕМ ПРОЗЫ АНАТОЛЯ КРЭЙДЗІЧА

А. Крэйдзіч належыць да ліку тых беларускіх празаікаў, якi пастаянна знаходзіцца ў нястомным пошуку спрадвечнай жыццёвай ісціны. Берасцейскі творца не проста жадае быць прысутным у Жыцці, але і сцвярджае ўсёй сваёй творчасцю: “жывое жывым жыве”. Невыпадкова матыў смакавання жыцця – адзін з галоўных у зборніку апавяданняў “Палескі Напалеон”.

Герой А. Крэйдзіча – чалавек звычайны: шчыры, добры, працавіты, цярплівы, экспрэсіўны, з пачуццём уласнай годнасці. Занатоўка мурашніка (апавяданне “Мурашнік”), за якім штодзённа назірае стары чалавек з дубовым лісцем на пятліцах, дапамагае пісьменніку раскрыць пошук героем узаемапаразумення з людзьмі, духоўнай раўнавагі. То ён захапляецца ўпартымі, дужымі стварэннямі, якія безупынна сцягваюць з усяго наваколля патрэбны будаўнічы матэрыял: “Дзіва, такое бервянішча. Каб у цябе хто спытаў – для чаго стараешся? Для жыцця, можа? Не, скажу я вам, не для жыцця, а каб зараза якая ўсё гэта параскідала і прабачэння не папрасіла. Папомніце маё слова” [1, с. 100]. То спачувае мурашам, якія пасля вялікай катастрофы “хапаліся за бліжэйшы кавалачак галінкі ці то за якую трэсачку і, нібыта нічога не здарылася, цягнулі да горкі. Нібыта ніхто і не наязджаў на іхняе жытло, ніхто іх не раскідваў, не здзекаваўся” [1, с. 102]. Прагматычная рэчаіснасць не дазваляе і чалавеку прайсці міма, патрабуе ад яго практычных дзеянняў. Ён ідзе па сякеру, вырубвае, заточвае чатыры бярозавыя слупкі, убівае іх вакол мурашніка, будуе агароджу.

Як бачна, мурашы жывуць тым, чым надарыла іх зямля, лёс, як кажуць, варыліся ў сваім саку: “Усё лёс. Усё лёс, дарагія мае… Значыць, я тут ніякім не магу быць ні памочнікам, ні дарадцам” [1, с. 103]. Сапраўды, спыніць жыццёвы працэс, мэтанакіраваную, самаахвярную працу не пад сілу аніякай трасцы.

Аўтар апавядання балюча адчувае, што ў свядомасці чалавека даволі часта тэндэнцыйнае дамінуе над гуманістычным. Ці не па гэтай прычыне А. Крэйдзіч уводзіць у сюжэтную канву твора драматычную карціну: стары чалавек, які спачувальна ставіўся да жывых істот, апусціў пружыністы моцны кій на маленькіх ганарліўцаў, што мітусіліся пад нагамі. Паводзіны мурашоў, якія, на думку выпадковага падарожнага, з пагардаю ставіліся да ўсяго, што адбывалася вакол, выбілі старога з раўнавагі: “Некалькі мурашоў брыкнулі на спіну, патузаліся, паварушылі

лапкамі, перавярнуліся, знайшлі кожны свой груз і, нібыта нічога не здарылася, заспяшаліся да свайго жытла" [1, с. 104]. На наш погляд, менавіта вобраз беларуса, які імкнецца да духоўнага сталення, дамагаецца самасцвярджэння, выступае на першы план у апавяданні "Мурашнік". Наша меркаванне пацвярджае эпіграф да твора: "Як людзі..., як мой народ" (паводле Алеся Наварыча).

Запамінальны, каларытны вобраз Ёрчыка з апавядання "Ёрчыкаў слуп". На першы погляд, гэта дзікун, зусім з глузду з'ехаў, як гаварылі пра яго мясцовыя жыхары. Ёрчыка не разумеюць не толькі аднавяскоўцы, але і сямейнікі, няўтульна яму сярод людзей, якія "круцяцца, як тыя вавёркі, нажываюць дабро. А навошта, каб хто іх спытаў. Яны і самі не ведаюць. А пасля паўміраюць, і ніхто пра іх не ўспомніць. Ды каму патрэбна такое жыццё! Але што мне да іх. Яны жывыя. А мне трэба думаць пра мёртвых. Мусіць жа, я для гэтага і на свет нарадзіўся" [1, с. 107]. Па гэтай прычыне і вырашыў Ёрчык пабудаваць вежу памяці. Знізу каменную сцяну апярэзваў надпіс: "Гэта памяць усім, хто калі-небудзь жыў у вёсцы Чыргі". Вышэй – ішлі сотні прозвішч. Для напісання літар майстар браў белыя цагліны, астатнюю прастору запаўняў камянямі, чырвонай цэглай. Безумоўна, абудзіць людзей ад бяспамяцтва – гэта важная задача грамадства, кожнага чалавека на зямлі. І гэта ў першую чаргу патрэбна жывым. Шкада, што гэтага не разумее "стваральнік памяці". Таму з лёгкасцю ахвяруе Ёрчык сям'ёй. Не пагарджае герой апавядання "Ёрчыкаў слуп" гарэлкай, якой глушыць маркотны стан душы. Думаецца, раней разгледжанае апавяданне – перасцярога тым, хто не задумваецца аб першапрычыне сваіх пакут, а здзейсненыя імі бяскрыўдныя і нават добрыя ўчынкі прыводзяць да сямейнай трагедыі, духоўнай дэградацыі асобы.

На думку празаіка, у жыцці нічога выпадковага няма. Так, звычайная снежка выклікала ў героя апавядання "Нічога не здарылася" плойму ўспамінаў і разваг, напалохала Максімавіча, як звалі яго ў рэдакцыі, прымусіла журналіста спыніцца, паспрабаваць разабрацца, каго ён пакрыўдзіў сваім артыкулам. Мажліва, выпусціў з-пад увагі важную акалічнасць, нейкую інфармацыю не ўлічыў. А можа гэта проста збег трагічных абставін, – разважае пісьменнік. А. Крэйдзіч з псіхалагічнай дакладнасцю паказвае, як страх можа паралізаваць чалавека, яго думкі, паводзіны: "Няўжо так нічога і не здарылася?.. Няўжо ўсе мае трывогі, пакуты – пустыя?.. Не можа таго быць, каб нічога не здарылася. Ну ніяк не можа быць..." [1, с. 115]. Як ні парадаксальна, але складваецца ўражанне, што празаік разам са сваім героем удзячны кусліваму, насмешліваму лёсу, які прымушае чалавека азірнуцца, задумацца.

Гарманічна ўпісваецца ў канву разваг апавяданне "Фантазія на тэму кахання". Сон-фантазію можна разумець як іншасказальнае вызначэнне

пісьменнікам творчага працэсу і адначасова як нейкую квінтэсенцыю самых супярэчлівых аспектаў чалавечай экзістэнцыі. Вядома, што пісьменнік не дае парад на шчаслівае жыццё, але А. Крэйдзіч паказвае, як кожны чалавек дамагаецца рэалізацыі сваіх абсалютных правоў.

Права на шчасце сцвярджаецца ў апавяданні “Шчаслівая ты, Ленка”. Дзяўчаты па пакоі інтэрната глядзяць на Ленку як на абранніцу нябёсаў: разумная, прыгожая, столькі хлопцаў закахана ў яе. І Ленка спрабуе адпавядаць гэтаму вобразу, хаця падобна на тысячы іншых нешчаслівых закаханых. Адчуванне безвыходнасці, беспрасветнага становішча лірычнага “я” ў раструшчаным свеце ахоплівае дзяўчыну пасля доўгачаканага нязздзейсненага спаткання: слёзы засцілалі вочы, нылі ногі, нацёртыя туфелькамі, сэрца з кожнай хвілінай шчымела ўсё больш і больш. Словы Наташы і Рыты “Шчаслівая ты, Ленка” замест звычайнага ранішняга прывітання выводзяць дзяўчыну з духоўнага здранцвення, дараць надзею на сустрэчу з абраннікам, адзіным і на ўсё жыццё.

Герой апавядання “Смех” марыць быць зразумелым, асабліва каханай дзяўчынай. Смех непаразумення ўспрымаецца маладым чалавекам як “рэшткі болю”, які каханая аддае яму. Невыпадкова празаік выкарыстоўвае азначэнне (“мярзотны смех”), звонкі, залівісты смех параўноўвае з тысячамі малюсенькіх званочкаў, якія “бязлітасна галасілі пад самым вухам, не давалі апамятацца, аглушалі” [1, с. 131]. Як ні дзіўна, але для героя здрада – гэта не само дзеянне, а тое, да чаго імкнецца чалавек у сваёй свядомасці. Па яго цвёрдым перакананні, сувязі з іншымі жанчынамі не варта прымаць да ўвагі пры высвятленні адносін, бо ў іх не было месца захапленню. “З кім я ні быў, маё сэрца належала табе. Пра гэта я не забываўся ні на хвіліну”. Жыццёвая пазіцыя героя А. Крэдзіча бліжэйшая людзям сталага ўзросту, маладым людзям, максімалістам ў выяўленні сваіх пачуццяў, цяжка зразумець паводзіны героя апавядання “Смех”. Апошні сказ твора “Мне захацелася, каб мяне зразумеў хоць адзін чалавек”, спадзяюся, адрасаваны тым, хто жыве пачуццямі, хто знаходзіцца пад уплывам энергіі жарсці.

Безумоўна, рэгулятыўная функцыя мастацтва дазваляе пісьменніку ўздзейнічаць на паводзіны чытача, змяняць яго намер, пабуджаць да дзеяння. Думкай, што “памяць сэрца мацнейшая за памяць розуму” [1, с. 134], прасякнута і апавяданне А. Крэйдзіча “Партрэт”. Па перакананні празаіка, не згубіць гэты набытак важна для кожнага чалавека, асабліва для творчых асоб. Стаўровіч – таленавіты мастак, да яго карцін камар носа не падточыць. Выкананы яны па ўсіх законах жывапісу, тэхніка адточана да дасканаласці, але палотны не грэюць... За шматлікімі гаспадарчымі, бытавымі клопатамі згубіў мастак недзе ў лабірынтах свядомасці адчуванне прыгажосці, уменне па-чалавечы, проста, з дзіцячай уражлівасцю глядзець на свет,

развучыўся плакаць. Невыпадкова А. Крэйдзіч уводзіць вобраз парасоніка-дзьмухаўца, у які ператвараецца Стаўровіч у сне. Вецер адносіць творцу ад тых рэчаў, ад якіх па шчоках у свой час беглі гарачыя ручаінкі. Кім павінен быць мастак: лекарам, чараўніком, павадыром, назіральнікам, суцяшальникам?.. Пошук адказу на гэтае пытанне, як бачна, не дае пакою пісьменніку. А. Крэйдзічу балюча, калі людзі не разумеюць каштоўнасці кнігі і часам глядзяць на яе як на прадмет інтэр'ера: "Ну й колер. Куды іх цяпер? У сценку я такую дрэнь не пастаўлю, увесь выгляд папсуе" [1, с. 182] (апавяданне "Плюшавае сабачаня"). Раман, герой раней названага твора, упэўнены: літаратура – гэта тая сіла, якая не дазволіць, каб "сцёрлася душа".

Празаік паказвае, як адарванасць ад родных каранёў небяспечна звужае духоўны свет чалавека. Менавіта па гэтай прычыне стары Грыб (апавяданне "Мухамор") не адпускае сваіх сыноў жыць у горад. "Гэтак і жывуць тутэйшыя куркулі Грыбы, перадаючы ў спадчыну ад старэйшых ды маладзейшых нажытае дабро, звычкі, характар, цягавітасць..." [1, с. 212]. Для А. Крэйдзіча, які сам родам з мястэчка Заверша Драгічынскага раёна, вёсачкі, дзе жывуць яго героі, стварае вобраз радзімы з яе жыццёвымі праблемамі, як водгалас вечнай праўды, дабра, прыгажосці.

Дзякуючы прозе А. Крэйдзіча, чытач у чарговы раз пераконваецца ў справядлівасці думкі, выказанай Кузьмой Чорным: "Чалавек – гэта цэлы свет", добры і злы, шчыры і хцівы, непаўторны і супярэчлівы... І кожны імкнецца быць у ім шчаслівым. Героі А. Крэйдзіча не паддаюцца спакусе ўцячы ад сябе, яны ў пошуку гарманічнага суіснавання з людзьмі ў "холадзе часу". Жанр твораў празаіка, які можна вызначыць як апавяданні інтэлектуальна-эмацыйнага ахопу жыцця, дапамагае раскрыць самасвядомасць героя, паводзіны яго ў часе і соцыуме.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Крэйдзіч, А. Палескі Напалеон : Аповесць, апавяданні / А. Крэйдзіч. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 223 с.